З музыкай па жыцці

Аўтар: Кінга Красіцкая
18.11.2018 00:00

“

У нас сапраўды шчаслівая сям’я – у ёй 5 дружных «я»!” – з такімі словамі ідуць па жыцці Аксана і Гжэгаж Станкевічы і іх дочкі Агнешка, Рэната, Юстына. Героі сённяшняга нумара “Слова Жыцця” добра вядомы не толькі ў сваім родным Сапоцкіне, але і ва ўсім Гродзенскім раёне. А ўсё дзякуючы іх захапленню музыкай і спевам. Сямейная традыцыя

У сям’і Станкевічаў усе так ці інакш звязаны з музыкай: бацька іграе на акардэоне і гітары, маці працуе музычным кіраўніком у Сапоцкінскай сярэдняй школе, дочкі спяваюць і іграюць на фартэпіяна і гітары. Станкевічы – дружныя, пазітыўныя, актыўныя. Пастаянна ладзяць сямейныя выступленні, развучваюць новыя песні, дзелячыся добрым настроем не толькі са сваімі блізкімі, але і з аднавяскоўцамі.

Гжэгаж Станкевіч, галава сям’і, распавядае, што традыцыя сямейнага музіцыравання цягнецца праз пакаленні. † – Мой дзядуля быў вельмі таленавітым скрыпачом, іграў на ўсіх вяселлях і забавах. Згодна з традыцыяй, хацеў перадаць сваё захапленне старэйшаму сыну, але той быў зусім далёкі ад музыкі. Мой бацька быў самым малодшым з сыноў, але больш за ўсіх астатніх праяўляў цікавасць да скрыпкі. Ад хлопца пастаянна хавалі інструмент, але той яго ўсё роўна знаходзіў. Дзеду нічога не заставалася, як навучыць малодшага іграць на скрыпцы, – гаворыць спадар Гжэгаж. – У в

ыніку з яго атрымаўся вельмі добры музыкант, без якога не абыходзілася ніводнае свята ў вёсцы. Я і мае браты таксама перанялі бацькава захапленне музыкай. Толькі я ўжо іграў не на скрыпцы, а на акардэоне і гітары. Калі прыйшоў з войска, стаў удзельнікам парафіяльнага гурта “Адкрытыя сэрцы”. Раней інтэрнэту не было, таму запісвалі словы песень у сшытак, зверху пазначалі акорды, часам самі падбіралі мелодыю. Касетны

магнітафон таксама быў вялікай раскошай, таму адзіная надзея была на радыё. Праслухаеш кавалачак песні, што паспееш – занатуеш, а пасля чакаеш, пакуль яна ў чарговы раз прагучыць у эфіры, каб дапісаць твор цалкам.

Калі Гжэгаж пабраўся шлюбам з Аксанай, нарадзіліся дочкі. Любоў да музыкі не згасла, а знайшла свой працяг у маладой сям'і.

– Дзяўчынкі пайшлі па мужу, маюць такі ж добры голас і слых, – распавядае Аксана Станкевіч. – Старэйшыя Агнешка і Рэната скончылі музычную школу, малодшая Юстына яшчэ давучваецца. Дочкі спяваюць у парафіяльным моладзевым хоры, неаднаразова ездзілі на парафіяду, з якой вярталіся з узнагародамі за ўдзел у вакальным конкурсе. Сёлета Рэната заняла II месца на фестывалі рэлігійнай песні, які праходзіў у гродзенскай парафіі Найсвяцейшага Адкупіцеля. Усе разам некалькі разоў прымалі ўдзел у конкурсе шматдзетных сем'яў. Калі старэйшай дачцы Агнешцы было ўсяго 3 гады, мы ўпершыню прынялі ўдзел у сапоцкінскім праглядзе калядак і пастаралак, і гэта стала нашай сямейнай традыцыяй. Цяпер кожны год з вялікай адказнасцю рыхтуемся, падбіраем рэпертуар. Зусім нядаўна, калі былі ў касцёле на св. Імшы, да мяне падышла бабуля, запыталася, ці плануем выступаць у гэтым годзе, і прапанавала праспяваць калядную песню, якую яна памятае яшчэ са свайго маленства. Напэўна, так і зробім, бо былі вельмі ўражаны прыгожым тэкстам гэтай калядкі.

Станкевічы падкрэсліваюць, што атрымаўшы ад Бога музычныя таленты, яны стараюцца іх не загубіць, не абленавацца, не ўзнесціся ў гардыні. У памяць аб пачынальніку прыгожай традыцыі музіцыравання захоўваюць дома сямейную рэліквію – дзедаву скрыпку, якой ужо каля сотні гадоў.

Самае галоўнае – гэта адзінства

З музыкай па жыцці

Аўтар: Кінга Красіцкая
18.11.2018 00:00



